***Л.А. Дзямешка,*** *прафесар,*
***С.А. Паўлава,*** *прафесар*

# ВІЗУАЛЬНАЯ І ЧЫТАЦКАЯ КУЛЬТУРА ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ: БІБЛІЯПЕДАГАГІЧНЫ АСПЕКТ

Сутнасць работы бібліятэкі заключаецца ў рэалізацыі чытацкай дзейнасці, інакш кажучы, у мэтанакіраваных дзеяннях па выбары, успрыманні і асэнсаванні друкаванай прадукцыі. Сучасныя даследаванні чытання дзяцей і падлеткаў сведчаць аб змяншэнні інтарэсу да чытання. Адзначаны найбольшая зацікаўленасць дзяцей і падлеткаў візуальнай інфармацыяй, захапленне Інтэрнетам, камп'ютэрнымі гульнямі, кіна-, відэа- і тэлепраграмамі. На Захадзе гэты працэс акрэслілі як "крызіс чытання" [1; 2].

У Рэспубліцы Беларусь таксама існуе такая праблема. Аб гэтым сведчаць вынікі сацыялагічнага даследавання "Структура і дынаміка дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь" [3]. Атрыманыя даныя паказваюць зніжэнне цікавасці да чытання, выцясненне кніжнага канала распаўсюджвання інфармацыі іншымі сродкамі, павышэнне іх ролі ў бюджэце вольнага часу дзяцей і падлеткаў. Назіраюцца павелічэнне долі аўдыё- і відэаканалаў трансляцыі культуры і пераарыентацыя культуры ў бок масавай.

У ходзе аналізу структуры дзіцячага чытання было высветлена, што чытанне не ўспрымаецца як від дзейнасці, які патрабуе адпаведных навыкаў і намаганняў.

У сувязі з гэтымі рэаліямі часу ў краіне інтэнсіўна ідзе пошук шляхоў узнаўлення інтарэсу да чытання, актывізацыі працэсу інкультурацыі дзяцей і падлеткаў. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчаць выкананне прэзідэнцкай праграмы "Дзеці Беларусі", якая прадугледжвае набыццё вопыту ўзаемадзеяння розных арганізацый, органаў, устаноў; сумеснае правядзенне цікавых, практычна карысных мерапрыемстваў з мэтай развіцця асобы дзіцяці, выкарыстанне дзеля гэтага інавацыйных тэхналогій [4].

Асаблівую ўвагу, на наш погляд, набывае дзейнасць бібліятэк па вызначэнні і стымуляванні станоўчага ўплыву візуальнай культуры на чытанне, інакш кажучы, неабходна знайсці правільныя суадносіны візуальнай і чытацкай культуры.

Тэрміны "візуальная культура", "візуальнае мысленне", "візуальнае ўспрыманне", "візуальныя камунікацыі", "візуальныя мадэлі" на сучасным этапе шырока ўжываюцца ў тэорыі дызайну,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

псіхалогіі, педагогікі, мастацтва, у семіётыцы, культуралогіі і інш. Мадэлі візуальных камунікацый у розных ракурсах і з розных пазіцый апісаны Р.Арнхеймам, У.Зінчанкам, А.Запарожцам, В.Розіным, Б.Чарневічам, Ф.Успенскім, А.Лявонцьевым [5]. Са сферы кінамастацтва вядомы адкрыцці, зробленыя ў 20-я гг. мінулага стагоддзя рэжысёрам С.Эйнштэйнам і аператарам Д.Вертавым, а ў філасофскім ракурсе – мысліцелем, багасловам і тэарэтыкам выяўленчага мастацтва П.Фларэнскім [6].

Розныя аспекты візуальнасці разглядаюцца тэарэтыкамі з пазіцый аб’екта і прадмета даследавання. Таму і шматлікія тэрміны, на думку расійскіх псіхолагаў У.П.Зінчанкі і В.М.Розіна, не маюць строгіх дэфініцый, а толькі адлюстроўваюць мноства ўяўленняў, якія ахопліваюць такія з’явы, як зрокавае (аптычнае) і інтэлектуальнае бачанне, зрокавае ўспрыманне і мысленне. Зрокавы вобраз, як азначае Р. Арнхейм, незвычайна аб’ёмны, таму што ў ім адначасова ўтрымліваецца інфармацыя аб каляровых, прасторавых, дынамічных і фігуратыўных характарыстыках прадметаў, да таго ж ён вельмі пластычны [5, с. 20].

Згодныя з яго пунктам гледжання, мы разглядаем канцэпцыю сучаснай візуальнай культуры з пазіцыі бібліятэказнаўства як падыход да асваення бібліятэчнай прасторы і арганізацыі дзейнасці бібліятэкі, дзе самакаштоўнасцю становіцца прадметнае асяроддзе, у тым ліку інфармацыйныя рэсурсы, рарытэты, меморыі. Пры гэтым патрэбна адзначыць, што ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці праблема выхавання візуальнай і чытацкай культур мае некалькі аспектаў.

Па-першае, неабходна дасканалае вывучэнне як аб’екта выхавання (дзяцей, падлеткаў), так і зместу візуальнай і чытацкай культур. Вядомы расійскі сацыёлаг С.А.Плотнікаў вылучае тры асаблівасці візуальнай культуры на прыкладзе захаплення дзяцей і падлеткаў тэлебачаннем: тып увагі, асаблівасці зместу, характар успрымання [1, с. 18]. Чытанне, паводле яго азначэння ў тэрміналагічных слоўніках, энцыклапедыях, з’яўляецца “адной з формаў камунікатыўнай, пазнавальнай і духоўнай дзейнасці асобы; спосабам моўных стасункаў людзей сродкамі друкаваных, рукапісных, электронных тэкстаў” [7, с. 1158]. Гэта найбольш эфектыўная інтэлектуальная тэхналогія засваення накопленых чалавецтвам ведаў. У межах чытання вызначаюцца агульная тэорыя, сацыялогія чытання (вывучае распаўсюджванне кніг і чытання, іх месца ў сістэме сучасных камунікатыўных сродкаў),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

псіхалогія чытання (разглядаюцца чытацкае развіццё асобы, праблемы ўспрымання тэкстаў), педагогіка чытання. Задачамі апошняй з’яўляюцца выяўленне і абгрунтаванне прынцыпаў і крытэрыяў фарміравання кола чытання, эфектыўнай сістэмы метадаў прапаганды кніг і кіраўніцтва чытаннем. Пры гэтым у большасці выпадкаў тэрміны “чытанне” і “чытацкая дзейнасць” выкарыстоўваюцца як сіномімы і ўзаемазамяняльныя.

Альтэрнатывай чытанню ў дзяцей з’яўляюцца не толькі тэлебачанне, але і вельмі распаўсюджаныя на сучасным этапе камп’ютэрныя гульні. Вядома, існуюць гульні, якія развіваюць творчасць дзяцей, навучаюць асновам навук, як, напрыклад, адукацыйныя і навучальныя праграмы. Але празмернае захапленне гульнямі зніжае чытацкую актыўнасць дзіцяці і шкодзіць здароўю.

Паводле даных даследаванняў чалавек запамінае 10% з прачытанага, 20% ад пачутага і 30% ад убачанага. Калі ён чытае, чуе і бачыць, ідзе найлепшае ўспрыманне інфармацыі [8]. Таму аптымальны варыянт – навучанне дзяцей медыяадукаванасці, інакш кажучы, неабходна спалучыць чытанне, тэлебачанне, відэапраграмы і камп’ютэрныя гульні. У гэтым працэсе нам уяўляецца некалькі кірункаў дзейнасці. Але ў першую чаргу неабходна дзяржаўная палітыка ў сферы падтрымкі чытання, яго стымуляцыі.

Па-другое, неабходна мэтанакіраванае навучанне падрастаючага пакалення мове сродкаў масавай інфармацыі (СМІ). Юныя чытачы павінны ведаць усе плюсы, якія даюць СМІ, і ўмець нейтралізаваць іх мінусы. Гісторыя навучання мове СМІ паўтарае этапы развіцця саміх СМІ. У 70-я гг. распрацоўваліся спосабы прыцягнення школьнікаў да кінамастацтва, ішло навучанне іх мове кіно. У 80-я гг. увагу педагогаў і даследчыкаў прыцягнула тэлебачанне, з’явіўся тэрмін “візуальная адукаванасць”.

Па-трэцяе, неабходны інтэграцыя, сінтэз візуальнай і чытацкай культур, іх узаемапранікненне і ўзбагачэнне, што магчыма сіламі розных структур грамадства.

На сучасным этапе бібліятэкі выкарыстоўваюць інавацыйныя тэхналогіі па спалучэнні візуальнай і чытацкай культур, па заахвочванні дзяцей і падлеткаў чытаннем. Станоўчай з’явай стала стварэнне пры бібліятэках медыятэк, якія спецыялізуюцца на розных носьбітах інфармацыі. Наменклатура іх паслуг шматлікая: выдача дзецям на дом матэрыялаў (дакументаў) на розных носьбітах, правядзенне культурных праграм, арганізацыя выстаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прагляд кіна-, відэа- і тэлепраграм з паслядоўнай арганізацыяй іх абмеркавання і рэкамендацыяй адпаведных кніг, прэзентацыя навін літаратуры з дапамогай камп’ютэрнай тэхнікі. Некаторыя медыятэкі ўтрымліваюць збор рэпрадукцый карцін (артатэкі), якія ставяць задачай духоўнае і эстэтычнае развіццё дзіцяці. Існуюць пры дзіцячых бібліятэках і відэатэкі, у якіх носьбітамі інфармацыі з’яўляюцца дыскеты, кампакт-дыскі. Медыятэкі пашыраюць магчымасці традыцыйнай бібліятэкі па прыцягненні дзяцей і падлеткаў да чытання, спалучаюць візуальную і чытацкую культуры, гэтаму садзейнічаюць і адпаведныя бібліятэчныя формы абслугоўвання.

Улічваюцца бібліятэкамі і новыя рэаліі ў прапагандзе кнігі і ўспрыманні самой бібліятэкі як кнігасховішча з аксесуарамі ў дапамогу раскрыццю інфармацыйных рэсурсаў.

Знешні выгляд бібліятэкі, вывескі з падсвечваннем, пандусы для дзіцячых калясак, чыста прыбраныя прыступкі, прыгожы інтэр’ер, фітадызайн, афармленне плакатаў, афіш, фірменная атрыбутыка – уся гэтая візуальная сімволіка з’яўляецца эфектыўным сродкам фарміравання станоўчых установак, сімпатый, уплывае на настрой, пачуцці і эмоцыі чытачоў.

Ідэалам з’яўляецца такая арганізацыя ўнутрыбібліятэчнага асяроддзя, калі любы элемент утрымлівае пэўную інфармацыю, арыентуе дзіця як чытача.

Паколькі візуальныя арыенціры ўспрымаюцца дзецьмі-чытачамі бібліятэкі ў першую чаргу імгненна, значнае месца ў бібліятэках займае метаінфармацыя. Яе можна класіфікаваць па дзвюх групах: першая – дапамагае чытачу арыентавацца ў памяшканні бібліятэкі ці ў яе структурных падраздзяленнях; другая – садзейнічае арыентацыі дзіцячага чытача ў кнігах, бібліятэчным фондзе. Да першай групы адносяцца перш за ўсё рэкламныя і кампазіцыйныя арыенціры: аб’явы, схемы, розныя піктаграмы, табло, паказчыкі размяшчэння аддзелаў бібліятэкі, даведнікі, выкананыя з мастацкім густам у ракурсе фірменнага стылю. Менавіта яны фарміруюць першапачатковае ўспрыманне выгляду бібліятэкі. Другая група арыенціраў – гэта класіфікацыйная, а часам і каляровая інфармацыя (напрыклад, з дапамогай колеру супервокладкі для дзіцячага чытача). Камп’ютэрныя тэхналогіі прапануюць шырокі спектр метаінфармацыйных сродкаў: розныя, у тым ліку і каляровыя вокны, меню, паказчыкі, кнопкі з выявай прадметаў-сімвалаў, дзеянняў, якія выкарыстоўваюць прынцып мнемонікі, і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метаінфармацыя пры абслугоўванні дзяцей забяспечвае камфортнасць, хуткасць пошуку інфармацыі з дапамогай алгарытмаў бібліяграфічнага пошуку, аблягчае доступ да інфармацыі, абумоўлівае характар узаемаадносін бібліятэкара з дзіцячым чытачом.

Такім чынам, практыка сведчыць аб наяўнасці ў бібліятэках базіснага матэрыялу для выхавання ў дзяцей-чытачоў візуальнай культуры, непасрэдна звязанай з іх чытацкай дзейнасцю і стымулюючай гэтую дзейнасць.

---


1. *Чудинова, В.* Союз вербальных и визуальных культур / В.Чудинова // Библиотека. – 1999. – № 6 – С. 17–19.

2. *Матлина, С.Г.* Инновационные технологии и разнообразие культур / С.Г.Матлина // Социально-культурные аспекты теории библиотечной инноватики. Румянцевские чтения. – М.: Пашков Дом, 2004. – С. 96–105.

3. *Красавцева, И.Н.* Средства массовой коммуникации в современном социокультурном контексте / И.Н.Красавцева // Социально-политическая ситуация Республики Беларусь: по материалам социологического мониторинга: сб. науч. тр. – Мн.: ИСПИ, 1998. – С. 175–184.

4. *Анализ* положения детей и женщин в Республике Беларусь. – Мн., Центр соц. и полит. исследований БГУ, 2004. – 104 с.

5. *Арнхейм, Р.* Искусство и визуальное восприятие / Р.Арнхейм. – М.: Искусство, 1974. – 140 с.; *Зинченко, В.П.* Современные проблемы образования и воспитания / В.П.Зинченко // Вопросы философии. – 1973. – № 11. – С. 14–18; *Успенский, Ф.И.* Очерки по истории византийской образованности / Ф.И.Успенский. – СПб., 1891. – 399 с.; *Запорожец, А.* Восприятие и действие / А.Запорожец. – М., 1967. – 281 с.; *Черневич, Б.* Язык графического дизайна / Б.Черневич. – М., 1975. – 199 с.; *Розин, В.М.* Визуальная культура и восприятие / В.М.Розин. – М., 2004. – 224 с.; *Леонтьев, А.Н.* Проблемы деятельности в психологии / А.Н.Леонтьев // Вопросы философии. – 1972. – № 9. – С. 104–115.

6. *Флоренский, П.А.* Обратная перспектива / П.А.Флоренский // Труды по знаковым системам. – Тарту, 1967. – С. 394–395, 400.

7. *Библиотечная* энциклопедия. – М.: Пашков Дом, 2007. – 1160 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. *Светлов, Б.В.* Мультимедийная культура как эстетический феномен информационного общества / Б.В.Светлов // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2008. – № 10. – С. 17–24.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ